# ЗАЎТРА — V УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 116 (28226) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**ЗАДАВАЙЦЕ ПЫТАННІ, ВЫКАЗВАЙЦЕ ПАЖАДАННІ**

Падчас правядзення пятага Усебеларускага народнага сходу будзе працаваць «гарачая» тэлефонная лінія. 22 чэрвеня 2016 года — з 11.00 да 18.00 і 23 чэрвеня 2016 года — з 10.00 да 13.00.

Кожны ахвотны можа патэлефанаваць па шматканальных тэлефонах: 276-00-00, 282-00-00, задаць пытанні, выказаць пажаданні. Код Мінска — 8-017.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Узаемадзеянне эканомікі і ідэалогіі павінна выходзіць на новы ўзровень. Сёння такі пасыл, як сацыяльна арыентаваная дзяржава, пераасэнсоўваецца. Гэта не эгаістычнае стаўленне да дзяржавы. Гэта ўсведамленне таго, што неабходна напружвацца, рабіць намаганні як прафесіяналу, як чалавеку, які развіваецца духоўна, маральна, творча, для таго, каб атрымаць у нашым агульным саюзе пад назвай Рэспубліка Беларусь часцінку перамог».*

# Краіна хараства




Фота БЕЛТА.

Удзельніцы конкурсу «Міс-Беларусь» у старажытных строях. СТАР. 7



## Месцы сілы Ядвігіна Ш. і Янкі Купалы

СТАР. 8–9

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19727,00 | ▼ |
| Еўра | 22368,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 307,68 | ▲ |
| Укр. грыўня | 793,37 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Водбліскі

## ДЛЯ СУСВЕТУ 75 — МАЛА...

Заўтра Брэсцкая крэпасць прачнецца на досвітку. Няважна, чыстае будзе неба або зацягнутае хмарамі — яно на колькі хвілін ператворыцца ў адчайна-насцярожанае ад гулу самалётаў і сірэн. Небу не патлумачыш, што гэта ўсяго толькі пастановачныя гукі, яны нагадваюць мірным людзям, які гэта жах — вайна, што прыйшла на нашу зямлю 75 гадоў назад. Бо для яго, для Сусвету, гэта занадта малы адрэзак часу, каб забыцца. Бо яшчэ недзе за тысячы светлавых гадоў у яго бяскрайніх абсягах не сціхлі стогны і галашэнні соцень тысяч зямлян, якіх забіла і зрабіла сіротамі тая вайна.



Людзі забываюць хутчэй. Тыя, каму ўсё роўна. Тыя, у каго ў сям'і няма забітых і асірацелых. Гэта не пра нас. 75 гадоў — усяго толькі два пакаленні. Дастаткова, каб сцішыць боль, але зусім мала, каб пазбавіцца памяці. СТАР. 4–5

■ Прыватызацыя жылля

## ДА АПОШНЯГА КЛІЕНТА

Да завяршэння прыняцця дакументаў на прыватызацыю жылых памяшканняў засталіся лічаныя дні



**1 ліпеня заканчваецца тэрмін прыёму заяў на прыватызацыю жылля. А вось пасля гэтай даты ўсе непрыватызаваныя кватэры будуць пераведзены ў разрад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання. Колькі падобнага жылля застаецца ў нашай краіне і што з ім будзе надалей? На гэтыя і іншыя пытанні адказваюць спецыялісты Мінжылкамгаса, Дзяржкаммаёмасці і сталічнай мэрыі.** СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!